# ДАГАВОР
# АБ ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ

Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан і Расійская Федэрацыя, якія далей называюцца Бакамі,

**грунтуючыся** на Дэкларацыі аб еўразійскай эканамічнай інтэграцыі ад 18 лістапада 2011 года,

**кіруючыся** прынцыпам суверэннай роўнасці дзяржаў, неабходнасцю безумоўнага прытрымлівання прынцыпу вяршэнства канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна,

**жадаючы** ўмацаваць салідарнасць і паглыбіць супрацоўніцтва паміж сваімі народамі пры павазе іх гісторыі, культуры і традыцый,

**выказваючы** перакананасць у тым, што далейшае развіццё еўразійскай эканамічнай інтэграцыі адпавядае нацыянальным інтарэсам Бакоў,

рухомыя імкненнем умацаваць эканомікі дзяржаў-членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і забяспечыць іх гарманічнае развіццё і збліжэнне, а таксама гарантаваць устойлівы рост дзелавой актыўнасці, збалансаваны гандаль і добрасумленную канкурэнцыю,

**забяспечваючы** эканамічны прагрэс шляхам сумесных дзеянняў, накіраваных на рашэнне пастаўленых перад дзяржавамі-членамі Еўразійскага эканамічнага саюза агульных задач па ўстойлівым эканамічным развіцці, усебаковай

мадэрнізацыі і ўзмацненні канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік у рамках глабальнай эканомікі,

**пацвярджаючы** імкненне да далейшага ўмацавання эканамічнага ўзаемавыгаднага і раўнапраўнага супрацоўніцтва з іншымі краінамі, а таксама міжнароднымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі і міжнароднымі арганізацыямі,

**прымаючы пад увагу** нормы, правілы і прынцыпы Сусветнай гандлёвай арганізацыі,

**пацвярджаючы** сваю прыхільнасць мэтам і прынцыпам Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а таксама іншым агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права,

дамовіліся аб наступным.

# ЧАСТКА ПЕРШАЯ
# ЗАСНАВАННЕ ЕЎРАЗІЙСКАГА ЭКАНАМІЧНАГА САЮЗА

## Раздзел I
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1
### Заснаванне Еўразійскага эканамічнага саюза. Праваcуб'ектнасць

1. Гэтым Дагаворам Бакі засноўваюць Еўразійскі эканамічны саюз (далей – Саюз, ЕАЭС), у рамках якога забяспечваецца свабода руху тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы, правядзенне скаардынаванай, узгодненай або адзінай палітыкі ў галінах эканомікі, вызначаных гэтым Дагаворам і міжнароднымі дагаворамі ў рамках Саюза.

2. Саюз з'яўляецца міжнароднай арганізацыяй рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі, якая мае міжнародную правасуб'ектнасць.

## Артыкул 2
## Азначэнні

Для мэт гэтага Дагавора выкарыстоўваюцца паняцці, якія абазначаюць наступнае:

«гарманізацыя заканадаўства» – збліжэнне заканадаўства дзяржаў-членаў, накіраванае на ўстанаўленне падобнага (супастаўнага) нарматыўнага прававога рэгулявання ў асобных сферах;

«дзяржавы-члены» – дзяржавы, якія з'яўляюцца членамі Саюза і Бакамі гэтага Дагавора;

«службовыя асобы» – грамадзяне дзяржаў-членаў, назначаныя на пасады дырэктараў дэпартаментаў Еўразійскай эканамічнай камісіі і намеснікаў дырэктараў дэпартаментаў Еўразійскай эканамічнай камісіі, а таксама кіраўніка Сакратарыята Суда Саюза, намеснікаў кіраўніка Сакратарыята Суда Саюза і саветнікаў суддзяў Суда Саюза;

«адзіная эканамічная прастора» – прастора, якая складаецца з тэрыторый дзяржаў-членаў, на якой функцыянуюць падобныя (супастаўныя) і аднатыпныя механізмы рэгулявання эканомікі, заснаваныя на рыначных прынцыпах і прымяненні гарманізаваных або ўніфікаваных прававых норм, і існуе адзіная інфраструктура;

«адзіная палітыка» – палітыка, якая ажыццяўляецца дзяржавамі-членамі ў вызначаных імі сферах, названых у гэтым Дагаворы, якая прадугледжвае прымяненне дзяржавамі-членамі ўніфікаванага прававога рэгулявання, у тым ліку на аснове рашэнняў органаў Саюза ў рамках іх паўнамоцтваў;

«міжнародныя дагаворы ў рамках Саюза» – міжнародныя дагаворы, якія заключаюцца паміж дзяржавамі-членамі па пытаннях, звязаных з функцыянаваннем і развіццём Саюза;

«міжнародныя дагаворы Саюза з трэцім бокам» – міжнародныя дагаворы, якія заключаюцца з трэцімі дзяржавамі, іх інтэграцыйнымі аб'яднаннямі і міжнароднымі арганізацыямі;

«агульны (адзіны) рынак» – сукупнасць эканамічных адносін у рамках Саюза, пры якіх забяспечваецца свабода перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы;

«распараджэнне» – акт, які прымаецца органамі Саюза і мае арганізацыйна-распарадчы характар;

«рашэнне» – акт, які прымаецца органамі Саюза і змяшчае палажэнні нарматыўна-прававога характару;

«скаардынаваная палітыка» – палітыка, якая прадугледжвае ажыццяўленне супрацоўніцтва дзяржаў-членаў на аснове агульных падыходаў, адобраных у рамках органаў Саюза, неабходных для дасягнення мэт Саюза, прадугледжаных гэтым Дагаворам;

«узгодненая палітыка» – палітыка, якая ажыццяўляецца дзяржавамі-членамі ў розных сферах і прадугледжвае гарманізацыю прававога рэгулявання, у тым ліку на аснове

рашэнняў органаў Саюза, у такой ступені, якая неабходна для дасягнення мэт Саюза, прадугледжаных гэтым Дагаворам;

«супрацоўнікі» – грамадзяне дзяржаў-членаў Саюза, якія працуюць у органах Саюза на аснове заключаных з імі працоўных дагавораў (кантрактаў) і не з'яўляюцца службовымі асобамі;

«мытны саюз» – форма гандлёва-эканамічнай інтэграцыі дзяржаў-членаў, якая прадугледжвае адзіную мытную тэрыторыю, у межах якой ва ўзаемным гандлі не прымяняюцца мытныя пошліны (іншыя пошліны, падаткі і зборы, якія маюць эквівалентнае дзеянне), меры нетарыфнага рэгулявання, спецыяльныя абаронныя, антыдэмпінгавыя і кампенсацыйныя меры, дзейнічаюць Адзіны мытны тарыф Еўразійскага эканамічнага саюза і адзіныя меры рэгулявання знешняга гандлю таварамі з трэцім бокам;

«трэці бок» – дзяржава, якая не з'яўляецца членам Саюза, міжнародная арганізацыя або міжнароднае інтэграцыйнае аб'яднанне;

«уніфікацыя заканадаўства» – збліжэнне заканадаўства дзяржаў-членаў, накіраванае на ўстанаўленне ідэнтычных механізмаў прававога рэгулявання ў асобных сферах, вызначаных гэтым Дагаворам.

Іншыя паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Дагаворы, разумеюцца ў значэннях, прыведзеных у адпаведных раздзелах гэтага Дагавора і дадатках да яго.